ПАДЗЕЯ

# НА СВЯЦЕ СЯБРОЎСКАЙ ГАРМОНІІ

**6 чэрвеня літаратары горада над Нёманам прынялі ўдзел у Х Абласным фестывалі кнігі «Гродзенскі ЛітФэст», у межах XV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур арганізаваным Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкай імя Я. Карскага.**

У гэтыя чэрвеньскія дні горад Гродна ў чарговы раз па традыцыі ператварыўся ў яркую, шумную і гасцінную сталіцу грандыёзнага свята, свята добрасуседства, міжнацыянальнага сяброўства і згоды паміж людзьмі розных нацыянальнасцей. Літаратура ва ўсе часы служыла ўмацаванню міжнародных сувязяў, міру і дружбы паміж рознымі краінамі і народамі. Таму без мастацкага слова не абыходзіцца ні адзін фестываль нацыянальных культур. Х Абласны фестываль кнігі «Гродзенскі ЛітФэст», пляцоўкі якога размясціліся ў Парку Жылібера, падарыў гродзенцам і гасцям абласнога цэнтра шмат цікавага і карыснага – шматлікія гульнявыя лакацыі, віктарыны, майстар-класы, эфектныя фотазоны. Папулярнае ў гараджан месца адпачынку ператварылася ў сапраўднае царства кнігі і кніжных герояў.

У музычна-паэтычнай праграме «Пісьменніцкія адкрыцці» («Писательские откровения») перад гасцямі ЛітФэсту выступілі паэты, аўтары і выканаўцы песень, людзі, якім выпала працягваць багатыя літаратурныя традыцыі Прынёманскага краю. Сярод іх – члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэты Вольга Алізар, Анатоль Апанасевіч, Кацярына Каламійцава, празаік Ліна Багданава, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая, публіцыст Уладзімір Ягорычаў, кандыдат у шэрагі арганізацыі Юлія Мельнік, а таксама члены Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея» на чале з пісьменніцай-педагогам Юліяй Чамярыс: паэты Станіслаў Вішнеўскі, Святлана Глембоцкая, Вольга Пянькова, Соф'я Судзьіна, Таццяна Лугавая, Ірына Полудзень. Прагучалі песні госці з Ліды, паэткі і выканаўцы Людмілы Краснадубскай (у выкананні аўтара і спявачкі Марыі Краўчук).

Урачыста адкрылі імпрэзу дырэктар ГАНБ імя Я. Карскага Марына Эдвардаўна Ігнатовіч; старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Антонаўна Кебіч; дырэктар навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы Мікалай Уладзіміравіч Грынько. Вядучыя – бібліятэкар ГАНБ імя Я. Карскага Людміла Протас і член СПБ, паэт Руслан Півавараў.

У літаратурна-песеннай праграме «Пісьменніцкія адкрыцці» («Писательские откровения») на беларускай і рускай мовах у аўтарскім прачытанні можна было пачуць творы гродзенскіх паэтаў з разраду грамадзянскай і філасофскай лірыкі. Выступоўцы закранулі тэмы гістарычнай памяці, народнай мудрасці, пераемнасці пакаленняў, а таксама дня нараджэння А. С. Пушкіна і 185-годдзя з дня нараджэння польскай пісьменніцы з Гродна Элізы Ажэшкі.




На кніжным падворку гаспадары-бібліятэкары абсталявалі аўтограф-зону для сустрэч з пісьменнікамі, дзе кожны аўтар мог прадставіць і падпісаць свае кнігі, пагутарыць з чытачамі, пачаставацца гарбатай, зрабіць фота на памяць. Творцы, чытачы – усе госці ЛітФэста з цікавасцю паўдзельнічалі ў літаратурнай гульні «Веру - не веру» (вядучы М. У. Грынько), наведалі фотазоны, павільёны раённых бібліятэк, адзначылі юбілеі класікаў, пагарталі іх кнігі. Насычаная праграма абласнога літаратурнага фестывалю не толькі ўпрыгожыла, дапоўніла новымі адценнямі святочную палітру фестывальнага жыцця, але і адлюстроўвала разнастайнасць, шматколернасць навакольнага свету. Свету, дзе не павінна быць месца войнам і хаосу, нянавісці і недаверу... «Чытайце гродзенскіх паэтаў!» – такім патрыятычным вершам-заклікам Людмілы

Антонаўны Кебіч завяршыўся фестывальны марафон літаратараў. А святочнае мора пачуццяў, фарбаў, мелодый, уражанняў працягвала бушаваць па ўсім гістарычным цэнтры Гродна. Падумалася: чалавечыя ўзаемаадносіны (творчыя, сяброўскія, суседскія) – гэта таксама мастацтва. Здольнасць цаніць у іх гармонію ёсць сапраўдная культура (незалежна ад нацыянальнасці). Такое вось пісьменніцкае адкрыццё.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** літаратары горада над Нёманам прынялі ўдзел у Х Абласным фестывалі кнігі «Гродзенскі ЛітФэст» у межах XV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Гродна, Парк Жылібера, 6 чэрвеня 2026 года.




БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ-ЮБІЛЯРЫ
2026
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы
Максім Багдановіч
Творы
Эліза Ажэшка
Над Нёманам
Кандрат Крапіва
Вершы, байкі
Іван Шамякін
Непаўторная вясна
Сэрца на далоні
Ніл Гілевіч
Вершы маты
Цётка
Іван Мележ
Творы
Максім Багдановіч


Назначь мне свиданье...
Мария Петровых
ВЕЛИКИЕ РОМАНЫ –
ЛУЧШИЕ ИСТОРИИ
ЛЮБВИ
Он и Она
Литературные герои
АЛЕКСАНДР ГРИН
Джейн Эйр
Шарлотта Бронте
Михаил БУЛГАКОВ
Мастер и Маргарита


Іван ШАМЯКІН
Іван Шамякін Збор твораў
ПЯТКА
ІВАН МЕЛЕЖ
ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ
ЗАВЕІ, СНЕЖАНЬ
Кандрат Крапіва 1
Кандрат Крапіва 2
ЛЮБОЎ ПРАСВЕТЛАЯ
РОДНЫЯ ДЗЕЦІ
МАКСІМ БАГДАНОВІЧ
ВЯНОК
ЦВЯТОК РАДЗІМЫ ВАСІЛЬКА
МЕМО Беларусь


ІВАНОЎСКІ
Гонар ваўкавыскай зямлі
Мікалай Пятровіч
Калі пяро душою піша—
Пакіне словы-сказы ўзоры,
Запоўняцца пустыя нішы,
Datуль гадамі іх нязучрці...
ЖЕМЧУЖИНА ПРИНЕМАНЬЯ
Путеводитель по истории, символам и уникальным переправам города







**Вядучыя ЛітФэсту Людміла Протас і Руслан Піваварaў**


РЭСПУБЛІКАНСКІ ФЕСТЫВАЛЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР
ЛитФест


РЭСПУБЛІКАНСКІ ФЕСТЫВАЛЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР







**На першым плане: Л. А. Кебіч, М. Э. Ігнатовіч, М. У. Грынько**





**Вольга Алізар**




**Анатоль Апанасевіч**



**Кацярына Каламійцава**



**Ліна Багданава**




Спяваюць Людміла Краснадубская і Марыя Краўчук (Ліда)



Уладзімір Ягорычаў




Юлія Мельнік



**Ганна Скаржынская-Савіцкая**




**Юлія Чамярыс**



**Соф’я Судзына**



**Вольга Пянькова**







Станіслаў Вішнеўскі



Святлана Глембоцкая



Таццяна Лугавая



Ірына Полудзень




**Людміла Кебіч**
**і Дзмітрый Радзівончык**






**Людміла Кебіч: «Чытайце гродзенскіх паэтаў!»**




**Усе разам**



**Людміла Кебіч**
**і Юлія Чамярыс**




**Навінкі кнігавыдання ад Ліны Багданавай**



**Святочнае фота з класікамі**




**Ганна Скаржынская-Савіцкая завітала ў госці да Пані Элізы**



**Адзінства пісьменнікаў і бібліятэкараў Гродна пад знакам аленя Святога Губерта**




СВЯТА
КНІГІ